МАГІЛЕЎСКІ АБЛАСНЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ
вул. Першамайская, 71
212030 г.Магілеў
Тэл. (0222) 32-67-91; факс (0222) 22-05-11
E-mail: oblisp@mogilev.by

МОГИЛЕВСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
ул. Первомайская, 71
212030 г.Могилев
Тел. (0222) 32-67-91; факс (0222) 22-05-11
E-mail: oblisp@mogilev.by

09.08.2023 № 1247-27-Кол

Разгледзеўшы калектыўны зварот, які паступіў у Магілёўскі абласны выканаўчы камітэт, паводле перайменавання ў г. Магілёве сквера імя Герцена ў Тэатральны сквер (далей – пытанне аб перайменаванні), паведамляем наступнае.

У адпаведнасці з артыкулам 15 Закона Рэспублікі Беларусь ад 16 лістапада 2010 г. № 190-З “Аб найменні геаграфічных аб’ектаў” (далей – Закон) грамадзяне ў галіне найменняў геаграфічных аб’ектаў маюць права выказваць меркаванні аб найменнях геаграфічных аб’ектаў, а таксама ўносіць прапановы аб прысваенні найменняў фізіка-геаграфічным аб’ектам, адміністрацыйна-тэрытарыяльным адзінкам, тэрытарыяльным адзінкам, якія з’яўляюцца населенымі пунктамі, раёнамі гарадоў, састаўным часткам населеных пунктаў і іх перайменаванні.

Пытанне аб перайменаванні разгледжана 24 мая 2023 г. на пасяджэнні камісіі па тапаніміцы і ўвекавечванню гістарычнай і культурнай спадчыны горада Магілёва. Разгледзеўшы дадзенае пытанне, камісія аднагалосна прыняла рашэнне аб перайменаванні сквера імя Герцена ў Тэатральны. Рашэнне камісіі было прынята з улікам асноўных прынцыпаў, пералічаных у артыкуле 4 Закона, у тым ліку паводле меркаванняў грамадзян Рэспублікі Беларусь (далей – грамадзяне), якія пражываюць на тэрыторыі, якая адносіцца да адпаведнага геаграфічнага аб’екта. У гэтай сувязі лічым, што рашэнне Магілёўскага гарадскога выканаўчага камітэта, прынятае на падставе абзаца трэцяга артыкула 11 Закона, не абмяжоўвае і не парушае правы, свабоды і законныя інтарэсы грамадзян.

Дадаткова інфармуем, што азнаямленне грамадзян па пытанні перайменавання было праведзена Магілёўскім гарадскім выканаўчым камітэтам з 17 мая па 1 чэрвеня 2023 г. пасродкам размяшчэння інфармацыі ў СМІ, у тым ліку на інфармацыйных парталах, сайце гарвыканкама. Ініцыятыва перайменавання была падтрымана большасцю грамадзян, якія прынялі ўдзел у абмеркаванні на сайце гарвыканкама.

Адзначаем, што найменне сквера “Тэатральны” адпавядае патрабаванням пункта 1 артыкула 16 Закона і ўказвае на характэрныя прыкметы гэтага аб’екта, улічвае геаграфічныя, гістарычныя, сацыяльныя, культурныя і іншыя ўмовы і асаблівасці мясцовасці, у якой ён размешчаны.

*Даведачна. Тэатральны сквер – самы стары сквер г. Магілёва. Закладзены ў 1829 г. па загадзе генерал-губернатара М.М. Мураўёва на месцы другой лініі гарадскіх абарончых умацаванняў XVI-XVIII ст. У 1888 г. на тэрыторыі сквера быў пабудаваны гарадскі тэатр.*

*Нягледзячы на афіцыйную назву “Сквер ім. А.І. Герцэна” (1919-2023 гг.), гараджане называлі сквер “Тэатральным” з прывязкай да месцазнаходжання.*

На сучаснай карце г. Магілёва назвы “Тэатральная плошча” не існуе. У сувязі з гэтым дубліраванне тапанімічных назваў адсутнічае. Юрыдычны адрас Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра вул. Першамайская, 7.

З мэтай больш шырокага доступу грамадзян да галасавання аб перайменаванні геаграфічных аб’ектаў Магілёўскаму гарвыканкаму ў далейшым рэкамендавана ажыццяўляць збор меркаванняў грамадзян не толькі ў фармаце анлайн, але і забяспечыць спосаб галасавання для тых, у каго няма доступу да Інтэрнэта.

У выпадку нязгоды з разглядам звароту, у адпаведнасці з артыкулам 20 Закона Рэспублікі Беларусь ад 18 ліпеня 2011 г. № 300-З “Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб”, Вы маеце права абскардзіць адказ у суд у парадку, устаноўленым заканадаўствам.

Намеснік старшыні
аблвыканкама В.А.Малашка

Трыфанава 75 18 36